# Рецензии

# Рэцэнзіі

# Reviews

*Гуль М. В.* **Иноязычная лексика в процессе становления и развития белорусской терминологии (на материале терминосистем филологии, философии и социологии) : монография** / М. В. Гуль ; М-во образования Респ. Беларусь, Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина. Брест : БрГУ, 2021. 220 с.

*Гуль М. У.* **Іншамоўная лексіка ў працэсе станаўлення і развіцця беларускай тэрміналогіі (на матэрыяле тэрмінасістэм філалогіі, філасофіі і сацыялогіі) : манаграфія** / М. У. Гуль ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. Брэст : БрДУ, 2021. 220 с.

*Gul M. V.* **Foreign language vocabulary in the process of formation and development of Belarusian terminology (based on terminology systems of philology, philosophy and sociology) : monograph** / M. V. Gul ; Minist. of educ. of the Repub. of Belarus, Brest State A. S. Pushkin Univ. Brest : Brest State A. S. Pushkin Univ., 2021. 220 p.

Апошнім часам прыкметна ўзрасла цікавасць да вывучэння спецыяльнай лексікі ў цэлым і асобных тэрмінасістэм у прыватнасці. Гэта заканамерная з'ява ў эвалюцыі мовазнаўчай думкі, абумоўленая, на наш погляд, некалькімі фактарамі. Па-першае, няспынннасць навукова-тэхнічнага прагрэсу стымулюе пашырэнне навуковага кругагляду і, як вынік, разгалінаванне сістэмы ведаў, што непазбежна вядзе да колькаснага павелічэння як саміх тэрмінасістэм, так і іх напаўнення. Па-другое, натуральная эвалюцыя навуковых поглядаў выклікае неабходнасць пераасэнсаваць і перааацаніць ранейшыя падыходы і дасягненні ў розных сферах чалавечай дзейнасці. Па-трэцяе, зменлівае ў часе ўздзеянне пазамоўных фактараў на развіццё, у прыватнасці, беларускай мовы і беларускага мовазнаўства вымушае навуковую грамадскасць, з аднаго боку, крытычна прааналізаваць наяўны вопыт і набыткі, а з другога – узважана і прадумана выпрацаваць падыходы і прынцыпы далейшых крокаў у тэрміналагічнай і тэрмінаграфічнай працы.

Аглядна-апісальны характар даследаванняў беларускай тэрміналогіі ўжо даўно саступіў месца дэталёваму аналізу розных аспектаў паходжання, утварэння і функцыянавання адзінак спецыяльнай лексікі. Адна з такіх прац – манаграфія М. У. Гуль, прысвечаная вывучэнню месца і ролі лексікі іншамоўнага паходжання ў станаўленні беларускай тэрміналогіі філасофіі, сацыялогіі і філалогіі. Асноўны змест прадстаўлены ў чатырох главах. У главе 1 «Беларуская нацыянальная тэрміналогія як аб'ект навуковага даследавання» разглядаюцца розныя падыходы да вызначэння сутнасці паняццяў «тэрмін» і «тэрміналогія». У асобных раздзелах прасочваецца гістарычны шлях фарміравання тэрміналогіі філасофіі і сацыялогіі ў працэссе развіцця філасофскай думкі розных краін у розныя эпохі, а таксама складванне філалагічнай тэрміналогіі ў мовазнаўчых даследаваннях і літаратурнай традыцыі. Асобная ўвага скіравана на сферы функцыянавання і фіксацыі, а таксама сучасны стан вывучэння названых тэрмінасістэм. У раскрыцці гэтых аспектаў аўтару манаграфіі дапамагло абагульненне багатага вопыту даследаванняў папярэднікаў.

Глава 2 «Асаблівасці фарміравання беларускай нацыянальнай тэрміналогіі» складаецца з трох раздзелаў. Першы з іх дае дэталёвае ўяўленне пра станаўленне і развіццё беларускай тэрміналогіі ў розныя перыяды на працягу XIX–XX стст. У другім раздзеле апісваюцца беларускія ўласнамоўныя сродкі (сярод якіх асноўнымі з'яўляюцца тэрміналагізацыя агульнаўжывальных слоў і словаўтварэнне) і запазычанні з іншых моў як асноўныя крыніцы складвання беларускай тэрміналогіі. Значная ўвага ў главе нададзена разгляду розных спосабаў утварэння тэрмінаў філасофіі, сацыялогіі

CC BY NC

і філалогіі: сінтаксічнаму, марфалагічнаму, лексіка-семантычнаму і марфолага-сінтаксічнаму. У заключэнні да главы канстатуецца, што асноўная роля ва ўтварэнні тэрмінаў філасофіі, сацыялогіі і філалогіі належыць сінтаксічнаму спосабу. Выклад у главе абапіраецца на распрацоўку пытання іншымі даследчыкамі, тэарэтычныя палажэнні ілюструюцца багатым фактычным матэрыялам.

У главе 3 «Іншамоўныя запазычанні ў беларускай нацыянальнай тэрміналогіі» ўвага скіравана на два аспекты. У першым раздзеле разглядаюцца шляхі і спосабы пранікнення іншамоўнай лексікі ў беларускую тэрміналогію, у сувязі з чым асобна апісваюцца непасрэдныя запазычанні з моў-крыніц і апасродкаваныя запазычанні. У другім раздзеле прадстаўлены асноўныя крыніцы іншамоўных запазычанняў, у адпаведных падраздзелах пададзены тэрміны грэка-лацінскага паходжання, галіцызмы, германізмы, русізмы, паланізмы. Усе групы тэрмінаў іншамоўнага паходжання разглядаюцца з пункту гледжання гісторыі іх пранікнення ў беларускую мову, фармальных прымет, прыстасавання да фанетычнага ладу беларускай мовы, асаблівасцей марфалагічнай і семантычнай адаптацыі. Вывады да главы праілюстраваны малюнкамі (дыяграмамі), якія яскрава сведчаць пра колькасную перавагу ў разгледжаных тэрмінасістэмах адзінак грэка-лацінскага паходжання (66,9 % ад усіх запазычанняў у філалагічнай тэрміналогіі і 59,2 % ад ўсіх запазычанняў у тэрміналогіі філасофіі і сацыялогіі), а таксама галіцызмаў (20,4 і 26,3 % адпаведна).

У главе 4 «Лексіка-граматычныя і функцыянальныя асаблівасці запазычаных тэрмінаў» разглядаецца пераважна словаўтварэнне тэрмінаў філасофіі, сацыялогіі і філалогіі ад асноў іншамоўных назоўнікаў, прыметнікаў і дзеясловаў. Аналіз паказаў, што іншамоўныя тэрміны-назоўнікі складаюць пераважную большасць у разгледжаных тэрмінасістэмах (92 % у філалагічнай і 94,7 % у філасофска-сацыялагічнай тэрміналогіі), значна саступаючы колькасна іншамоўным тэрмінам-прыметнікам і тым больш тэрмінам-дзеясловам. Акрамя гэтага, увага надаецца сінаніміі і функцыянаванню тэрміналагічных адзінак філасофіі, сацыялогіі і філалогіі.

У заключэнні манаграфіі зроблены высновы па выкладзеным у главах матэрыяле. Спіс выкарыстанай літаратуры ўтрымлівае 199 выданняў, 6 з якіх замежныя. Ёсць і спіс крыніц выкарыстанага фактычнага матэрыялу – 11 пазіцый, сярод якіх – галіновыя слоўнікі і энцыклапедыі, выдадзеныя на працягу апошніх 100 гадоў.

У цэлым манаграфія М. У. Гуль з'яўляецца грунтоўным даследаваннем месца і ролі іншамоўнай лексікі ў працэсе фарміравання беларускай філалагічнай і філасофска-сацыялагічнай тэрміналогіі. Паказальна, што для глыбокага разгляду пытання была выкарыстана вялікая колькасць моваўнаўчых прац. Аўтар сапраўды выдатна арыентуецца ў навуковай літаратуры па тэме. Праўда, меркаванні іншых вучоных месцамі занадта часта сустракаюцца на старонках кнігі, аўтарскае разуменне асобных палажэнняў схавана ад чытача ў калейдаскопе цытат і спасылак. Такі выклад можна ўбачыць, напрыклад, на старонках 33, 80, 90–93, 104, 148 і інш. Здараецца, што побач падаюцца амаль тоесныя словы розных аўтараў. Напрыклад, на с. 104 у межах аднаго невялікага абзаца бачым: «Лексіка грэчаскага паходжання складае *адзін з самых ранніх пластоў*… <…> Грэцызмы пачынаюць актыўна пранікаць… *у сувязі з прыняццем хрысціянства і распаўсюджаннем рэлігійнай літаратуры* [спасылка 1]. Грэцызмы належаць да старажытнай часткі іншамоўных лексем у беларускай мове [спасылка 2]. Грэцызмы пачалі актыўна прыходзіць… *пасля прыняцця хрысціянства, калі перакладалася рэлігійная літаратура*… [спасылка 3]».

Недарэчным уяўляецца проціпастаўленне тэрміналогіі і літаратурнай мовы. Сустракаюцца няўдалыя фармулёўкі на гэты конт: «…у тэрмінаўтварэнні выкарыстоўваюцца тыя ж спосабы словаўтварэння, якія з'яўляюцца прадуктыўнымі і ў літаратурнай мове» (с. 52); «…семантычная дэрывацыя ў тэрмінаўтварэнні мае некаторыя асаблівасці ў параўнанні з літаратурнай мовай» (с. 79); «…у тэрмінаўтварэнні выкарыстоўваюцца тыя ж спосабы словаўтварэння, што і ў літаратурнай мове» (с. 87); «…у тэрмінаўтварэнні семантычная дэрывацыя не мае працяглага працэсу эвалюцыі, як гэта адбываецца ў літаратурнай мове» (с. 178) і інш. Відаць, літаратурнай мовай у манаграфіі называецца агульнаўжывальная лексіка. Менавіта ёй аб'ектыўна проціпастаўляецца лексіка абмежаванага ўжытку (выкарыстання), куды і ўваходзяць тэрміны як частка спецыяльнай лексікі.

Незразумела, якое значэнне мае і якую ролю выконвае слова «нацыянальная» ў назвах глаў, раздзелаў («Беларуская нацыянальная тэрміналогія») і ў тэксце (напрыклад, с. 7, 53). Гэты няўдалы, у пэўнай ступені плеанастычны, выраз стаў моўным штампам, у сувязі з чым успрымаецца як лексічная памылка.

Звяртаюць на сябе ўвагу табліцы, размешчаныя ў кожным параграфе трэцяй главы. Адны з іх даюць колькасную характарыстыку тэрмінаў рознага паходжання (грэка-лацінскага, нямецкага, а таксама галіцызмаў, русізмаў, паланізмаў) у розныя перыяды фарміравання і развіцця прааналізаваных тэрмінасістэм. Але паколькі гістарычныя перыяды разгляду аб'ектыўна ва ўсіх табліцах адны і тыя ж (пурыстычны, мадыфікаваны антыпурыстычны, сучасны), агульная колькасць тэрмінаў і колькасць іншамоўных тэрмінаў, якія разглядаюцца ў працы, таксама велічыні нязменныя. Атрымліваецца, што ўсе табліцы адрозніваюцца паміж сабой лічбамі толькі

ў двух слупках, дзе пададзена колькасць адзінак пэўнага паходжання ў філалогіі (адзін слупок), філасофіі і сацыялогіі (другі слупок). Усе астатнія лічбы дубліруюцца ва ўсіх табліцах. Таму думаецца, што было б мэтазгодна скласці адну агульную табліцу, у якой для нагляднасці і пераканальнасці былі б прадэманстраваны таксама працэнтныя суадносіны, або зусім не змяшчаць гэтыя табліцы, паколькі ў вывадах да главы 3 звесткі з усіх шасці табліц прадстаўлены ў выглядзе слупковай дыяграмы. Тое ж тычыцца і табліц, у якіх прадстаўлена колькасная характарыстыка тэрмінаў рознага паходжання ў прааналізаваных тэрмінасістэмах. І тут зменлівыя (нерэгулярныя) звесткі пададзены толькі ў адным слупку (колькасць тэрмінаў грэка-лацінскага паходжання, або галіцызмаў, або англіцызмаў і г. д.). Між тым дзве дыяграмы ў канцы главы фактычна не толькі замяняюць усе шэсць табліц, але і больш выразна дэманструюць матэрыял.

Адзначаныя недахопы хутчэй за ўсё сталі вынікам адсутнасці рэдактарскай і карэктарскай працы над выданнем, што адчуваецца і па асобных дробных момантах.

Безумоўнай вартасцю манаграфіі з’яўляюцца два дадаткі, дзе змешчаны алфавітны пералік прааналізаваных у працы адзінак. Дадаткі мелі б яшчэ большую каштоўнасць, калі б побач з кожным тэрмінам было ўказанне старонкі, на якой ён разглядаецца.

Манаграфія М. У. Гуль – гэта новае цікавае і важкае слова ў беларускім мовазнаўстве, а таксама вялікі крок наперад у вывучэнні этапаў складвання гуманітарнай тэрміналогіі беларускай мовы, даследаванні дэрывацыйнага патэнцыялу іншамоўных адзінак, генетычным апісанні тэрміналогіі філасофіі, сацыялогіі і філалогіі.

Кніга будзе карыснай і цікавай не толькі для выкладчыкаў і студэнтаў пры вывучэнні адпаведных дысцыплін, але і для лінгвістаў, навуковыя інтарэсы якіх знаходзяцца ў галіне беларускай тэрміналогіі і тэрмінаграфіі. Даследаванне не застанецца па-за ўвагай тых, хто неабыякавы да праблем далейшага развіцця і больш шырокага выкарыстання беларускай мовы.

***А. В. Губкіна***[1]

[1]*Алена Васільеўна Губкіна* – кандыдат філалагічных навук, дацэнт; дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Елена Васильевна Губкина* – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета.

*Elena V. Gubkina*, PhD (philology), docent; associate professor at the department of Belarusian linguistics, faculty of philology, Belarusian State University.

E-mail: *palvas@tut.by*